# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

26 ліпеня 2019 г. № 30 (515)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


Спецвыпуск



Гродзенская вобласць

Рэгіёны: па сутнасці справы



Фота БелТА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЖЫЦЦЁ ВІРУЕ НА ПАМЕЖЖЫ





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У верасні Гродзенская вобласць адзначыць знамянальную падзею — 75-годдзе свайго заснавання. Да юбілею вобласць атрымае нямала падарункаў. Да гэтай даты ўводзяцца чатыры сацыяльна значныя аб'екты — дзве школы, дзіцячы садок і Палац творчасці. У Гродне будуць адкрыты новыя маршруты, парк грамадскага транспарту папоўняць 10 аўтаномных тралейбусаў.**

Напярэдадні свята ў раёнах пройдуць дні прадпрыемстваў. У рэгіёне нямала значных прадпрыемстваў, чыя прадукцыя вядомая і папулярная ў краіне. Будуць ушанаваны найлепшыя працаўнікі ўсіх сфер дзейнасці, заслужаныя работнікі — прыклад прафесіяналізму і адданасці справе.

Убачаць свет дзевяць новых выданняў, якія прысвечаны Гродзеншчыне. У рэгіёне будзе ажыццяўляцца праект «На мяжы гісторыі», які ўключае ў сябе больш за 70 захапляльных і пазнавальных вандровак па самых цікавых мясцінах Прынёмання. Такія экскурсіі пройдуць ва ўсіх раёнах і стануць прэзентацыяй новых турыстычных маршрутаў. Велічным абяцае быць і заключнае мерапрыемства, якое адбудзецца 20 верасня ў абноўленай зале абласной філармоніі. У ім прымуць удзел ганаровыя госці, а таксама дэлегацыі з усіх раёнаў.

«Звязда» таксама не застанецца ўбаку ад гэтай важнай падзеі. Сёння мы даём старт сумеснаму праекту нашага выдання і мясцовых уладаў Гродзеншчыны. Мы раскажам, як жывуць і працуюць жыхары Іўя, горада, які называюць «сталіцай татар». Здзейснім падарожжа ў Мір, каб даведацца, як развіваецца турыстычная інфраструктура. Пройдзем па безбар'ерным Гродне, дзе вырашаюцца праблемы інклюзіўнага пражывання. А яшчэ завітаем у зялёны куток жылога мікраёна, дзе створаны сапраўдны дэндрарый, таксама пазнаёмімся з актыўнай жанчынай, начальнікам камітэта тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, якая імкнецца абудзіць ініцыятыву жыхароў.

Мы будзем працягваць праект і знаёміць нашых чытачоў з Гродзенскім рэгіёнам напярэдадні яго слаўнага юбілею.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на стар. 4—16

ЭКАНОМІКА І РЭГІЁНЫ

# Партнёрскія стасункі

## Каля 15 дагавораў аб супрацоўніцтве і 20 камерцыйных кантрактаў плануецца падпісаць падчас Першага Форуму рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана, якія адбудзецца ў Мінску 29—30 ліпеня

**Аб гэтым паведаміла журналістам намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА перад пашыраным пасяджэннем арганізацыйных камітэтаў дзвюх краін.**

На неабходнасць правядзення форуму на самым высокім узроўні звярнуў увагу **старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ**, адкрываючы пасяджэнне аргкамітэтаў:

— Мерапрыемства вельмі адказнае — яно праходзіць у рамках візіту прэзідэнта Узбекістана ў нашу краіну, — падкрэсліў ён.

Як паведаміла віцэ-спікер верхняй палаты беларускага парламента, Першы Форум рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана можна лічыць незвычайным, бо ён мае адрозненні ў падыходах, згодна з якімі адбываецца падрыхтоўка да аналагічных Форумаў рэгіёнаў Беларусі і Расіі. З беларускага боку тут задзейнічаны Урад і Нацыянальны сход (Палата прадстаўнікоў і Савет Рэспублікі).

— Аснова форуму — гэта «дарожная карта» супрацоўніцтва, распрацаваная па даручэнні кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі падчас яго візіту ва Узбекістан, і падпісаная прэм'ер-міністрамі, — адзначыла яна. — Цяпер неабходна праанялізаваць, якім чынам выконваецца гэты дакумент, як функцыянуе таваправодная сетка, якім чынам развіваюцца новыя сумесныя прамысловыя прадпрыемствы, як бакі супрацоўнічаюць у IT-сферы і гэтак далей.

Менавіта таму арганізатары прынялі рашэнне пабудаваць работу форуму па трох асноўных кірунках, якія будуць разглядацца на тэматычных секцыях: першая ахопіць работу аграпрамысловага сектара (за яе адказвае Урад), другая закране пытанні ў сферы прамысловай кааперацыі (гэта зона адказнасці Палаты прадстаўнікоў), і трэцяя будзе датычыцца супрацоўніцтва ў сферы IT-тэхналогій, сумеснага развіцця навукі і адукацыі (за арганізацыю яе работы нясе адказнасць Савет Рэспублікі).

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Саюзныя праграмы




Для павышэння ўзроўню жыцця людзей і развіцця памежных тэрыторый. стар. 2

### Да змен гатовы



Атрымаць больш паўнамоцтваў, а разам з тым і адказнасці, мясцовыя ўлады не баяцца. стар. 4

### Без бар'ераў



Ці могуць людзі з абмежаванымі магчымасцямі адправіцца ў вандроўку самастойна? стар. 14

### Дэндрарый паміж высотак



Былы авіятар самастойна зрабіў са звычайнага двара шыкоўны кветнік. стар. 16